Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

ЯК ПРАВІЛЬНА ЎЖЫВАЦЬ ПЕСТЫЦЫДЫ І НАВОШТА ІХ ЧАРГАВАЦЬ?

Прамысловыя прэпараты па-ранейшаму не выклікаюць вялікага даверу, аднак пры гэтым навука не стаіць на месцы, і якасць сродкаў барацьбы з пустазеллем і са шкоднікамі штогод толькі расце. Яны сталі самай сапраўднай палачкай-ратавалачкай сучаснага садоўніка. Аднак пры ўсім пры гэтым трэба памятаць, што прэпараты не з'яўляюцца панацэяй і не даюць 100 % гарантыі абароны ад няпрошаных гасцей. Будзе больш правільна сказаць, што выкарыстанне спецыяльных сродкаў не знішчае ўсіх шкодных насякомых, якія жывуць на пэўным участку, а памяншае іх папуляцыю да межаў, якія не перашкаджаюць гаспадарчай дзейнасці чалавека.

Навошта чаргаваць?

Шмат хто ведае пра тое, што частае выкарыстанне аднаго і таго ж антыбіётыку пры лячэнні хвароб з часам прыводзіць да таго, што патагенныя бактэрыі робяцца да яго неадчувальныя. Менавіта таму пры правядзенні паўторнага курса тэрапіі лекары прызначаюць сродак з іншым актыўным рэчывам. Аднак мала хто задумваецца пра тое, што дакладна такое ж «прывыканне» ўзнікае і ў хвароб і шкоднікаў, якія насяляюць участак. Чым часцей вы будзеце ўжываць прэпараты з адным і тым жа дзеючым рэчывам, тым большую яго дозу давядзецца выкарыстоўваць кожны наступны раз. У канчатковым выніку гэта прывядзе да таго, што вы не проста павялічыце рэзістэнтнасць пустазелля і шкоднікаў да ядаў, але і нанесяце адчувальную шкоду навакольнаму асяроддзю. Каб такога не адбылося, трэба старанна прытрымлівацца рэкамендацый па ўжыванні і абавязкова чаргаваць прэпараты.

Пры выбары пестыцыду трэба арыентавацца не на назву, а на дзеючае рэчыва. Часта пад рознымі гандлёвымі назвамі стаіць адзін і той жа хімікат. Не дзіва, што выкарыстанне такіх сродкаў не прыводзіць да жаданага выніку.

Што такое біяпрэпараты і як іх ужываць?

Апошнім часам набіраюць папулярнасць інсектыцыды бактэрыяльнай прыроды. Яны амаль бясшкодныя як для чалавека, так і для іншых жывых арганізмаў, таму іх адносяць да 4-га класа небяспекі. Аднак ужыванне такіх прэпаратаў эфектыўна толькі пры выкананні пэўных умоў:

1. Невысокая колькасць шкоднікаў. Калі тых стала занадта шмат, то справіцца з імі вам не дапаможа ні адзін біяпрэпарат. Для выратавання ўраджаю давядзецца звярнуцца па дапамогу да «класічных» хімічных прэпаратаў. Пры выкананні пэўных умоў дапускаецца камбінаванне сродкаў.

2. Правільная тэмпература. Для апрацоўкі раслін яна павінна вагацца ў межах 18—25 °С.

3. Узрост шкодніка павінен быць аптымальны. У кожнага віду ён прыпадае на розныя фазы развіцця.

Сярод недахопаў біялагічных прэпаратаў можна адзначыць непрацяглы тэрмін іх дзеяння і няздольнасць змагацца са шкоднікамі, якія знаходзяцца ўнутры раслін.

Выбіраючы спосаб абароны свайго агарода, арыентуйцеся не толькі на грамадскую думку, але і на пэўныя навуковыя звесткі. Прымяненне любых прэпаратаў патрабуе здаровага розуму і цвярозага падыходу.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.09	16.50	7.41
Віцебск —	9.05	16.33	7.28
Магілёў —	8.59	16.40	7.41
Гомель —	8.47	16.45	7.58
Гродна —	9.23	17.07	7.44
Брэст —	9.15	17.14	7.59

Месяц

Першая квадра ў 9.58. Месяц у сузор'і Рыб.

Імяніны

Пр. *Марыі, Адама.*
К. *Барбары, Хрысціны, Бярнарда, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Трэцякласнік прыходзіць дадому са школы і працягвае бацьку дзённік. Бацька бачыць адзнакі і абурана пытаецца:

— І як ты растлумачыш мне ўсе гэтыя траякі і двойкі?!

Сын:

— Лепш ты растлумач мне, што гэта — гены ці выхаванне?

— Вы ў школе як вучыліся?

— За грошы.

— А ў інстытуце?

— За вялікія грошы.

Калі блогер перастаў раптам мацюкацца і пачаў посціць высокамаральныя пасты, значыць, сярод падпісчыкаў з'явілася яго мама.

Пераўсталюй чалавеку Windows, і ён будзе задаволены адзін дзень.

Навучы яго пераўсталёўваць Windows самастойна, і ён усім скажа, што ён праграміст.

caricatura.ru

Ну і ну

Схапіў у салоне муляж тэлефона

Так грамадзянін «павіншаваў» сябе са святам

Своеасабліва вырашыў адзначыць свой трыццаць першы дзень нараджэння раней неаднаразова судзімы жыхар Віцебска.

Каля 17 гадзін мужчына адправіўся ў салон сувязі, дзе адкрыта выкраў выставачны асобнік муляжа тэлефона коштам восем рублёў. Камера відэаназірання зафіксавала, як падазраваны зайшоў у памяшканне і пачаў разглядаць гаджэты. У нейкі момант ён схапіў першы тэлефон, які трапіў пад руку, і паспяшаўся збегчы з месца злачынства.

Прадаўцы салона выклікалі міліцыю. Тады ж і высветлілася, што здабычай зламысніка стаў не новенькі гаджэт, а яго муляж. Неўзабаве супрацоўнікам крымінальнага вышуку стала вядомая і асоба мужчыны. Спрабуючы сысці ад адказнасці, ён некалькі дзён жыў на здымнай кватэры, паведаміла аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама. Нягледзячы на ўсе спробы схавацца ад праваахоўнікаў, падазраваны быў затрыманы. У дачыненні да яго распачата крымінальная справа за рабаванне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Даты Падзеі Людзі

4 СНЕЖНЯ

У краіне

1874 год — нарадзіўся Леў Абрамавіч Альпяровіч, беларускі мастак. Пісаў партрэты, пейзажы, бытавыя кампазіцыі. Усяго ў музейных фондах захоўваецца каля 50 яго жывапісных і графічных работ. Памёр у 1913 годзе.

1939 год — на тэрыторыі Заходняй Беларусі, уз'яднанай з БССР, створаны Баранавіцкая, Беластоцкая, Брэсцкая, Вілейская, а таксама Пінская вобласці. У выніку на тэрыторыі Беларусі тады стала 10 абласцей.

1949 год — нарадзіўся Сяргей Міронавіч Ушэранка, беларускі вучоны ў галіне матэрыялазнаўства, доктар тэхнічных навук (1998). Аўтар навуковых прац па матэрыялазнаўстве пры дынамічных нагрузках. Распрацаваў метады і тэхналогіі атрымання новых кампазіцыйных матэрыялаў.

1954 год — нарадзіўся Вячаслаў Вячаслававіч Мазанік, беларускі вучоны ў галіне тэхнічнай кібернетыкі, доктар тэхнічных навук (1993). У 1977 годзе скончыў Мінскае вышэйшае інжынернае зенітна-ракетнае вучылішча. Аўтар навуковых прац па вылічальных сетках і сістэмах рэальнага часу, перадачы даных па валаконна-аптычных лініях сувязі.

1959 год — у Мінску адкрыты Літаратурны музей Якуба Коласа (цяпер Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа).

1989 год — утворана Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.

У свеце

1894 год — нарадзіўся Мікалай Васільевіч Сяргееў, расійскі артыст тэатра і кіно, народны артыст РСФСР. Здымаўся ў фільмах «Вялікая сям'я», «Бацькі і дзеці», «Андрэй Рублёў» і іншых. Памёр у 1988 годзе.

1909 год — бізнесменам Джонам Амброзам О'Браянам быў заснаваны канадскі хакейны клуб «Манрэаль канадыенз» — найстарэйшы клуб НХЛ, 24-разовы пераможца Кубка Стэнлі. 54 члены гэтага клуба ўключаныя ў Залу славы хакея.

1914 год — нарадзіўся Рудольф Хаўснер, аўстрыйскі мастак-гравёр, скульптар. Аўтар карцін «Каўчэг Адысея», «Адам» і іншых. Памёр у 1995 годзе.

1954 год — заснавана Міжнародная федэрацыя пісьменнікаў і журналістаў, якія пішуць пра турызм.

1989 год — 44-я сесія Генеральнай Асамблеі ААН без галасавання ўхваліла Міжнародную канвенцыю аб барацьбе з вярбоўкай, выкарыстаннем, фінансаваннем і навучаннем наймітаў.

1989 год — заснавана міжнародная канфедэрацыя таварыстваў спажыўцоў.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае міністэрствам інфармацыі рэспублікі беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 4261.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 снежня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12